УДК 811.161.3’42(043.3) + 821.161.3.09(092)(043.3)

**Ключавыя рэлігіёнімы ў тэкстах Уладзіміра Арлова**

Пятрова Н. Я.
Беларускі нацыянальны тэхнічыны ўніверсітэт

У тэкстах У. Арлова асобныя рэлігіёнімы частотна і функцыянальна вылучаюцца. Гэта такія ключавыя словы, як *грэх, душа і смерць.* Яны ўжываюцца ў многіх творах аўтара, набываюць разнастайныя сэнсы і адценні, выяўляюць светапогляд пісьменніка: *Тады пакарай яе катаў, пакарай медыкуса, бо грэх ягоны трыкроць варты смерці!* [Маналог святога Пётры, с. 10][*]; *На мае словы, што мы з ім жывём у граху, а таму душы нашы пасля смерці асуджаныя на пакуты, мой другі нявенчаны муж адказваў сваёй блюзнерскай малітваю: “Не веру ў Бога, не прагну неба, не баюся пекла, не турбуюся пра Божы суд, не трывожуся пра цела, а пагатоў пра душу, якая памрэ разам са мною”* [Тры мужы спадарыні Дамінікі, с. 82]; *Пан інстыгатар, безумоўна, ведае і пра Сымона Буднага, які загубіў сваю душу, насмеліўшыся крытыкаваць Новы запавет* [Місія папскага нунцыя, с. 94]; *У трывозе сэрца маё, бо паўдзённы вецер прынёс да нас чорную смерць, і невідочныя стрэлы яе працялі ўжо мастака Джакома, што размалёўваў капліцу святой Магдалены* [Кроніка Лаўрына Баршчэўскага, с. 15]; *Той застрэліўся праз няшчаснае каханне, і Ігнату некалькі дзён не давала спакою пытанне: што думае і адчувае чалавек перад смерцю і што такое сама смерць?* [Далёка да вясны, с. 215].

У выніку даследавання асобных тэкстаў Уладзіміра Арлова высветлена, што аўтара непакояць вечныя філасофскія пытанні: што такое смерць, што адбудзецца пасля яе, што з’яўляецца самым вялікім грахом і інш. Таксама пісьменніка цікавіць душа беларуса, але ён імкнецца скіраваць яе на правільны шлях, каб яна заставалася вернай вечным хрысціянскім каштоўнасцям і мела моцную маральную аснову. Аўтар сцвярджае рэлігійную заглыбленасць беларусаў, іх скіраванасць да духоўнага, верыць у моц чалавека, у яго патэнцыяльныя магчымасці спасціжэння ісціны і спадзяецца, што пасля смерці кожны чалавек пакіне пасля сябе толькі светлы адбітак. Асноўная задача У. Арлова, на нашу думку, – дапамагчы сучаснікам кампенсаваць духоўныя страты савецкага часу, далучыць звычайнага беларуса да святыняў хрысціянскай культуры, якая зараз асабліва запатрабавана, каб вытлумачыць сэнс існавання на зямлі.

[*]Тут і далей прыклады прыводзяцца паводле выдання: Арлоў, У. Каханак яе вялікасці: Гістарычныя апавяданні, эсэ / У. Арлоў. – Мн.: І.П. Логвінаў, 2004. – 252 с..